4) вызначэнне месца і ролі прамежкавай, этнічна і рэгіянальна структураванай культуры Беларусі ў еўрапейскім і сусветным культурна-гістарычным працэсе;

5) усведамленне змястоўнага і структурнага адзінства эканамічнай, палітычнай, прававой, маральнай, рэлігійнай, мастацкай і філасофскай культуры.

**Г.Н.Пілевіч,**
*суіскальніца*

## ПРАГРЭС І ЧАЛАВЕК

XX ст. можна назваць стагоддзем трыумфу навук і адначасова глабальных катастроф: з аднаго боку, адкрыццё ядзернай энергіі, з другога — экалагічныя катастрофы; з аднаго боку, небывалы росквіт інфарматыкі, які дае бязмежныя магчымасці для росту культуры і асветы, з другога — разбуральны рост злачыннасці, наркаманіі, СНіДу, сексуальнай маніі; з аднаго боку, фантастычныя адкрыцці ў навуцы і тэхніцы, якія абвясцілі аб радыкальным перавароце чалавечага быцця, а з другога — страты чалавечых каштоўнасцей, замена якім пакуль не знойдзена. Між тым этнічная і нацыянальная нянавісць, якая ўзрушыла свет, прадаўжае і зараз страшыць людзей.

Стагоддзе небывалага навуковага прагрэсу стала сведкай амаральных крывавых разборак. Індывідуальны геній чалавецтва прыгожы, але прамысловасць псуе планету. І паколькі прамысловасць — тварэнне чалавечых рук, то ў першую чаргу ад чалавека залежыць, наколькі маральнай будзе рэалізацыя геніяльнага патэнцыялу, што супрацьстаіць культуры і духоўнасці, пераход за якія паграджае самазнішчэннем і грамадскай катастрофай.

Адзін з буйнейшых фізікаў XX ст. М.Борн на схіле жыцця прыйшоў да вываду аб тым, што нежыццяздольнасць навукі заключаецца ў служэнні ведам дзеля саміх ведаў. М.Бярдзяеў і іншыя мысліцелі лічылі, што навука "ёсць эканамічнае прыстасаванне да сусветнай данасці", што яна мае "жыццёва-карыслівы характар" і "прагматычную прыроду", якую раскрыў Ф.Бэкан у XVIII ст. Навука, як яна склалася ў апошнія стагоддзі, стала адгароджвацца не толькі ад маральных і эстэтычных матываў, але і ад самой ісціны, таму што, пачынаючы з часоў

Рэнесансу, спрабавала пабудаваць грамадства на безрэлігійным фундаменце. Катэгорыя "святога" практычна страціла сэнс, а навука і тэхніка ператварыліся ў магутную разбуральную сілу, якая процістаіць духоўна-маральнай культуры. Але грэбанне хрысціянствам аказалася пагібельным, і збыліся прарочыя словы Ф.Цютчава: "Не плоць, а дух разбэсціўся ў нашы дні".

Часам бывае цяжка захаваць аптымістычны погляд на будучае чалавецтва, таму што ўсе "прагрэсы рэакцыйныя, калі гіне сам чалавек". Гэта не толькі гіпербала, але і пазіцыя, якая супадае з навукай. Ніякая эпоха не ведала такога росквіту навукі і такіх тэхнічных дасягненняў, ніколі сацыяльныя эксперыменты не праводзіліся ў такіх маштабах; "усё дзеля чалавека" — такое крэда века, напісанае на ўсіх сцягах. Здавалася, можна было б чакаць, што людзі пачнуць набліжацца да ідэалу.

Аднак прагрэс ведаў і грамадскія змены паказалі, што не ў іх ключ да сапраўднага адраджэння чалавека, што не могуць яны вылечыць яго, бо ён сам па сабе істота дысгарманічная. Занадта часта заваёвы навукі аказваліся накіраванымі супраць саміх людзей, мастацтва служыла разбэшчванню, высокія словы аб гуманнасці і свабодзе — падману і прыгнёту. Іншымі словамі, многае змянілася ў свеце, не змяніўся толькі чалавек.

Выдатныя гуманісты і мысліцелі XIX—XX стст. з трывогай гаварылі аб працэсе дэградацыі культуры, таму што духоўная культура чалавека развіваецца інакш, чым матэрыяльная. Да гэтага вываду М.Бярдзяеў прыйшоў яшчэ ў гады першай сусветнай вайны, калі зразумеў значэнне атамнай вайны, і значэнне атамнай энергіі для пераўтварэння свету. "Калі чалавек зможа разлажыць атам і здабыць страшэнную энергію, якая ў ім заключана, — пісаў М.Бярдзяеў, — то гэта будзе не толькі сацыяльны, але і касмічны пераварот. Чалавеку даюцца жудасная разбуральная і стваральная сіла і ўлада. І ад яго духоўнага стану будзе залежыць, накіруе ён гэтыя сілу і ўладу на стварэнне ці разбурэнне". На працягу XX ст. бездна паміж нашымі навуковымі ведамі і нашай маральнай няспеласцю пашыралася. І асабліва сумна, што і чалавек усё менш задумваецца над тым, што навукова-тэхнічная сістэма разраслася і стала не сродкам, а самамэтай, і прафесійна-функцыянальнае развіццё чалавека цяпер не ўзгоднена з яго духоўным развіццём. Прагрэс непазбежна патрабуе маральнага абнаўлення, таму што развіццё інтэлекту не прычына высокай маральнасці і высакароднасці, і калі чалавек не будзе ўдасканальваць душу ў маральных адносінах

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

прапарцыянальна інтэлектуальнаму прагрэсу, то яму пагражае выраджэнне ці пагібель.

Чалавецтва не становіцца лепшым па яго ўласным жаданні. Ніхто не можа зрабіць чалавецтва лепшым, спадзеючыся на добрыя якасці, якімі быццам яно першапачаткова надзелена. Міф аб спрадвечнай дабрыні чалавека і аб непазбежным руху чалавецтва да прагрэсу падораныя як марксістамі, так і заходнееўрапейскім векам Асветы. Мы не адмаўляем таго добрага, што можна ўзяць з ідэй Асветы, але дзіўна, як гэты міф змог выжыць і па-ранейшаму аказваць уплыў на мысліцеляў, нягледзячы на трагічны вопыт XX ст. Няўжо забыты адкрыцці ў сферы псіхалогіі і антрапалогіі?

Менавіта ў эпоху трыумфу тэхнічнай цывілізацыі псіхааналіз паказаў усю глыбіню хваравітай ненармальнасці чалавека. Ён аказаўся няздольным узняцца на адпаведную духоўную вышыню. З Евангеллем чалавек змог стварыць інквізіцыю ў імя свабоды, роўнасці і братэрства. Гэта ён, услаўляючы розум, прывёў свет у вар'яцтва. Псіхалагічны метад З.Фрэйда раскрыў перад сучасным чалавецтвам бездань яго скажонага, ненармальнага і хворага душэўнага жыцця. Платон, св. Аўгусцін, К'еркегор, Шэкспір, Дастаеўскі і многія іншыя даследавалі глыбіню чалавечай прыроды. Розум ледзь спраўляецца з мужнымі хвалямі падсвядомых дэманічных інстынктаў, якія цяжка выгнаць і якія, нават падаўленыя разумнымі намаганнямі, дрэмлюць у кожным, як спора хваробатворнай бацылы. Але ніхто, бадай што, ярчэй Ф.Дастаеўскага не раскрыў тую глыбіню страшэннай душэўнай разбэшчанасці, якая хаваецца ў людзях. Ён паказаў, якія скажоныя формы прымае імкненне людзей да самасцвярджэння. "Чалавеку патрэбна аднаго — толькі самастойнага жадання, чаго б гэтая самастойнасць ні каштавала і да чаго б ні прывяла! Ф. Дастаеўскі перастаў хваліць чалавека і сказаў праўду аб тым, што ў кожным сядзяць лябядкіны, галядкіны і смердзяковы. Ён быў не адзіны. Ці не ўславіў Ш.Бодлер "кветкі зла"? У тыя ж гады, калі Ф.Дастаеўскі ствараў галерэю сваіх страшных герояў, А.Рэмбо напісаў "П'яны карабель" — бязглуздую фантасмагорыю аб жыцці чалавека, а Ж.Гюісманс прыадкрыў у сваіх раманах заслону над светам скажэнняў і кашмару. Паводле вызначэння О.Шпенглера, гэта "фаустаўская цывілізацыя". Усім вядомая класічная трагедыя Гётэ. Доктар Фауст— "чалавек навукі"! — заключае дагавор з д'яблам. Той выконвае ўсе яго пажаданні ў абмен на душу. "Асноўныя страсці чалавека, —

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

заўважае псіхааналітык Э.Фром, — крыюцца не ў інстынктыўных патрэбнасцях, а ў спецыфічных умовах чалавечага быцця, у патрэбнасці знайсці новыя адносіны паміж чалавекам і прыродай, пасля таго як чалавек страціў першапачатковыя адносіны з ёю". Інакш кажучы, гэтыя адносіны церпяць крах менавіта таму, што ў чалавеку перамагаюць ірацыянальныя сілы, якія прымушаюць яго баяцца свабоды і параджаюць у ім прагу ўлады і разбурэння.

Чалавеку дастаткова свайго розуму дзеля таго, каб пазнаць свет, сцвердзіць панаванне над ім і тым самым сцвердзіць свой праметэеўскі дух разбурэння. Якім страшэнным, агідным і злосным паўстаў чалавек перад самім сабой! Адбылося "новае адкрыццё чалавека". Яно аказалася адкрыццём, якое можа прывесці ў роспач. Паступова пачалі здагадвацца аб тым, што тайна людскога зла крыецца не толькі ў сацыяльным асяроддзі, якое само з'яўляецца вынікам гэтага зла. З кожным дзесяцігоддзем гэта станавілася выразней, бо ніколі раней людзі не мелі такіх спрыяльных умоў існавання і ніколі раней духоўны крызіс не дасягаў такога катастрафічнага размаху, як цяпер. Між тым, калі чалавечая прырода не сапсаваная, то паляпшэнне матэрыяльных умоў павінна вызваляць яе станоўчыя якасці і даваць магчымасць развівацца. Уласцівасці, якія прынята называць "зверам у чалавеку", пад уплывам цывілізацыі павінны, здавалася б, адступаць на другі план, але нічога падобнага не адбываецца.

У XX ст. атрымалі нябачнае развіццё шляхі зносін, чалавек сапраўды стаў уладаром сушы, мора і паветра. Медыцына перамагла шмат небяспечных хвароб, тэхніка зрабіла рэвалюцыю як у сродках вытворчасці, так і ў быце. Гісторык будучага, вывучаючы XX ст., знойдзе шмат прыгожага. Але гэтае прыгожае вечнае, яно праяўлялася ў людзях заўсёды, нават тады, калі яны не мелі тэлевізараў і ракет.

А сапраўды новае нашых дзён палохае гісторыю. Сусветныя войны, масавыя забойствы насельніцтва, таталітарныя рэжымы, рэпрэсіі, развал вялікай дзяржавы — СССР, ядзерная зброя, якія нябачнай атрутай паступова зацягваюць зямны шар, карупцыя ў верхніх эшалонах улады, беспрацоўе, збядненне народа, заказныя забойствы, наркаманія, прастытуцыя, небывалае распаўсюджванне псіхічных і ракавых захворванняў, СНІД ідуць поруч з тэхнічным прагрэсам. Цывілізацыя паступова выцясняе культуру. Надыходзячая экалагічная і духоўная катастрофа не можа быць прадухілена толькі тэхналагічнымі рашэннямі. Павінна быць вырашана праблема змянення спосабу існавання чалавека на Зямлі, якая залежыць ад адносін чалавека

да вышэйшых духоўных каштоўнасцей, таму што душа ніколі не ўбачыць прыгажосці, калі яна сама не стане прыгожай.

Прагрэс без чалавечнасці, мудрасці, любві да высокіх духоўна-маральных каштоўнасцей — нішто, ён патрабуе маральнага абнаўлення, таму што ў ім разбураецца чалавек. Чалавецтва павінна зазірнуць, нарэшце, у бездань чалавечых страсцей — нянавісці і любові, помслівасці і здольнасці дараваць. У працах па псіхіятрыі шмат пішуць аб помсце і яе ўплыве на чалавека, але аб дараванні — амаль ніколі. А яно заслугоўвае сур'ёзнай увагі. Дакладней, узаемасувязь паміж дараваннем і пакаяннем. Гэтую праблему трэба старанна даследаваць, пакаянне — дараванне павінна стаць практыкай узаемаадносін на ўсіх узроўнях. Калі ігнараваць ролю маральнага і духоўнага фактараў у прыродзе чалавека, чалавецтва будзе рухацца да хаосу, да бездані эканамічных і палітычных крызісаў. Але калі мы здзейснім гэты радыкальны духоўны пераварот, катастрофу можна пераадолець, а значыць, чалавецтва пераадолее дробязнасць нацыяналізму на ўсіх узроўнях і зробіць крок насустрач сусветнай чалавечай супольнасці. Чалавецтва, якое здзейсніла вялікія дасягненні ў навуцы і тэхніцы, цяпер павінна ўзрасці маральна і духоўна, каб ступіць у XXI ст.

**С.Л.Вілейка,**
*дацэнт*

## ФАРМІРАВАННЕ БЕЛАРУСКАЙ ІДЭІ — АДНА З ВАЖНЕЙШЫХ МЭТ КУЛЬТУРНАЙ ПАЛІТЫКІ

Разам з фарміраваннем усебакова развітой асобы, якая вылучаецца ў якасці стратэгічнай задачы культурнай палітыкі, на першы план выходзіць задача фарміравання беларускай ідэі.

Сёння назіраецца рост нацыянальнай свядомасці народа, аб чым сведчаць шматлікія праяўленні занепакоенасці аб недахопе ўвагі да адраджэння і развіцця беларускай культуры і мовы. Гучаць заклікі аб праяўленнях нацыянальных гордасці і годнасці. Актывізавалася ў гэтым напрамку дзейнасць творчых саюзаў.

Як вядома, высокія нацыянальныя пачуцці і ідэі могуць трансфармавацца ў практычныя дзеянні, стаць матэрыяльнай сілай. Многія вядуць размову аб Беларусі, аб адраджэнні яе культуры. Але пры відавочнай агульнасці дэклараваных мэт



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ